12+

Просто хорошая газета

Отдушина

Основана 18 октября 2002 года

№51 (694) 20 декабря 2017 года

Издатель УП «Газета Слонимская»

Выходит один раз в неделю

ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

«Культура павінна быць стрыжнем самой ідэі і ідэалогіі горада»

Таленавітыя людзі, як правіла, стараюцца з`ехаць са Слоніма ў Мінск ці за мяжу, каб развівацца далей. Але ёсць і выключэнні. Восенню 2017 года ў Слонім са сталіцы Беларусі пераехаў знакаміты беларускі мастак Мікола Бушчык. Спадар Мікола адразу ўліўся ў культурніцкае жыццё горада і ўжо стаў генератарам новых ідэй. Напрыклад, мастак распрацаваў праграму развіцця мастацкай інфраструктуры Слоніма і выслаў гэтую праграму ў Міністэрства культуры Беларусі, а адказы з Міністэрства былі накіраваныя ў Гродзенскі аблвыканкам і Слонімскі райвыканкам.

Карэспандэнт «ГС» з гэтай нагоды пазнаёміўся і паразмаўляў з Міколам Бушчыкам.

— Я вельмі хачу разгарнуць працу з уладамі Слоніма, каб у горадзе ўтварыць гарадскую карцінную галерэю. Пакуль згода ёсць фактычна ўмоўная. Улады спасылаюцца на тое, што няма на гэта магчымасцяў і сродкаў. Спадзяюся, што з наступнага года з галерэяй штосьці зрушыцца, бо ў бок мастацтва ўлады нармальна глядзяць. Цяпер у нас ствараецца таварыства мастакоў «Слонім-ART» — праходзім інстанцыі на зацвярджэнне свайго статуса. Тут можна зрабіць усе ўмовы, каб праводзіць мясцовыя і рэспубліканскія пленэры. Таксама я планую праводзіць міжнародныя пленэры, бо ў мяне шмат сяброў-мастакоў з розных краін свету, якія і цяпер згодныя сюды прыехаць папрацаваць і ўславіць малую маю радзіму. Таму з часам можна тут стварыць карцінную галерэю і сабраць творы слонімскіх і іншых беларускіх, а таксама замежных мастакоў. Галерэя прыцягвала б да сябе ўвагу і мясцовага насельніцтва, і турыстаў, была б такім файным культурніцкім месцам у цэнтры Слоніма. Ужо цяпер у мяне ёсць такое пагадненне пра галерэю з Алегам Мечыслававічам Таргонскім. Трэба чакаць, калі фактычна гэта зладзіцца, бо ўсё адразу не бывае.

— Які яшчэ плён можа даць галерэя ў Слоніме?

— Я лічу, што на базе гэтай галерэі трэба будзе ўтварыць мастацкую школу, бо тыя мастацкія гурткі, што існуюць разрознена ў Слоніме, фактычна не даюць мэтанакіраванай навуковасці ў гэтай галіне. Маленькі мастак павінен набываць свае веды метадычна з дапамогай прафесіяналаў, каб шлях у мастацтва ў яго потым быў вольны і прыгожы. Ёсць планы ладзіць тут розныя выставы і імпрэзы і зрабіць Слонім такой тэрыторыяй, дзе мастацтва ў пашане і мастакі ў павазе. Менавіта культура павінна быць стрыжнем самой ідэі і ідэалогіі горада. Я спадзяюся, што ў гэтым накірунку атрымаецца ўсё належным чынам, і ўлады падтрымаюць, і грамадства зразумее.

— Раскажыце калі ласка, як Вам пасля сталіцы было вярнуцца на Слонімшчыну?

— Гэта мае родныя мясціны. Я родам з Дзераўной, што каля Слоніма. Калі я жыў у Мінску, тут жыў мой бацька, які быў вельмі светлым чалавекам. Цяпер у Слоніме жыве мая старэнькая цётка Стася, сваякі. Мне тут камфортна. Тым больш тут я магу стварыць майстэрню адразу ў сваім доме. Я і купляў у Слоніме прыватны дом дзеля гэтага. Таксама мы разам з жонкай і дачкой вельмі любім ездзіць у Дзераўную, дзе дагэтуль стаіць мая родная бацькоўская хата.

— Спадар Мікола, хоць Вам ужо і 69 гадоў, Вы з`яўляецеся маладым бацькам.

— Так, маёй дачушцы Паўлінцы пяць гадкоў. Дачушка для мяне — гэта як новы подых жыцця, яна ўліла ў мяне новыя сілы, здароўе і радасць. Бо калі бачыш сваё маленькае, забываешся пра ўсе нягоды і зноў адчуваеш сабе 30-40-гадовым чалавекам. Я заўсёды здзіўляюся свабодзе разумення маленькага чалавека, яго адчуванням і поглядам на жыццё. Гэта станоўча для мяне — як першы снег, як вясновая вясёлка. Гэта шчасце ды ўсмешкі.

— Раскажыце, калі ласка, пра Вашых старэйшых дзяцей.

— Мой старэйшы сын жыве ў Пецярбургу, з`яўляецца чэмпіёнам свету і Еўропы па лацінаамерыканскіх танцах. Шмат перамяшчаецца па свеце, і я нават не ведаю, напрыклад, дзе ён цяпер. Другі сын жыве ў Канадзе. Ён таксама, як і я, мастак. Працуе ў канадскай філіі Галівуда. Справа ў тым, што здымаць кіно танней у Канадзе, чым, напрыклад, у Каліфорніі.

— Якім Вы бачыце Слонім праз 10 гадоў, калі Вашы культурніцкія планы здзейсняцца?

— Вельмі прывабным турыстычным месцам. Бо, на мой погляд, па турыстычным патэнцыяле Слонім, не пабаюся гэтага сказаць, не саступае Варшаве.

Мікіта ПАСТУХОЎ

ФОТА АЎТАРА

N.PASTYHOW@GMAIL.COM



Мікола Бушчык

ГЭТЫ ТЫДЗЕНЬ У ГІСТОРЫІ СЛОНІМШЧЫНЫ: 18 — 24 снежня

✓18 СНЕЖНЯ 1501 ГОДА жыхары Слоніма збіралі «татарскія ўпамінкі» — падатак, які выплачваўся крымскім татарам, каб не дапусціць іх набегу на беларускія землі.

✓21 СНЕЖНЯ 1864 ГОДА ў Слоніме быў закрыты бернардынскі манастыр, у школе якога на той час навучалася 90 чалавек. Мясцовая бібліятэка з 2774 тамоў была перададзена ў Віленскую цэнтральную публічную бібліятэку. Будынак манастыра быў перададзены праваслаўнай царкве. Сёння тут размяшчаецца царква святой Тройцы і інтэрнат медыцынскага каледжа.

✓22 СНЕЖНЯ 1942 ГОДА фашысты падчас аблавы знішчылі 229 жыхароў вёскі Акунінава і спалілі 111 яе двароў.

✓24 СНЕЖНЯ 1942 ГОДА фашысты расстралялі 14 жыхароў вёскі Азарычы.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

Расписание движения поездов по станции Слоним с 10 декабря 2017 года

Расписание дизель-поездов региональных линий эконом-класса

№ поезда, сообщение	Время отправления из: Барановичи-Полесские	Время отправления из: Гродно, Волковыска	Время прибытия на ст. Слоним
На Волковыск, Гродно			
6281/6280 Барановичи – Гродно	06:04	–	07:09
6283/6282 Барановичи – Гродно	08:14	–	09:36
6285/6284 Барановичи – Гродно	13:04	–	14:28
6287 Барановичи – Волковыск	21:09	–	21:32
На Барановичи			
6292 Волковыск – Барановичи	–	04:32	05:58
6294/6293 Гродно – Барановичи	–	06:15	09:41
6296/6295 Гродно – Барановичи	–	09:23	13:15
6298/6297 Гродно – Барановичи	–	13:38	17:48

Расписание поездов межрегиональных линий эконом-класса

№ поезда, сообщение	Время отправления из: Минска	Время отправления из: Гродно	Время прибытия на ст. Слоним	Время прибытия на ст. Гродно
На Гродно				
627Б Минск – Гродно	15:35	–	18:58	22:40
631Б Гомель – Гродно	22:14	–	02:54	06:56
На Барановичи				прибытия на ст. Минск
628Б Гродно – Минск	–	23:40	03:48	07:28
632Б Гродно – Гомель	–	16:30	19:49	23:40

Источник: сайт БЖД





КОРАТКА


ФОТА МІКІТЫ ПАСТУХОВА

У Слонімскім цэнтры культуры і адпачынку 14 снежня прайшла традыцыйная сустрэча ўдзельнікаў клуба «Надзея». Гэтым разам імпрэза была прысвечана песням іх маладосці — рамансам.

Прэмію са спецыяльнага фонду Прэзідэнта (92 рублі) атрымаюць пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд — вучань СШ №8 Дзмітрый Бартош (геаграфія), навучэнка гімназіі №1 Алеся Мялешка (беларуская мова і літаратура), вучань СШ №9 Дзмітрый Шаўкаловіч (працоўнае навучанне) і вучаніца СШ №3 Лізавета Пракаповіч (алімпіяда школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства»).

У Слоніме ў мікрараёне Паўднёвы Захад пабудуюць 119-кватэрны жылы дом за кошт сродкаў тэхніка-эканамічнай дапамогі Кітая. У доме прадугледжаны пераважна адна- і двухпакаёвыя кватэры, якія атрымаюць сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды, адзінокія людзі. Гэтыя кватэры нельга будзе прыватызаваць ці прадаць.

Падрыхтавала Жанна ІВАНОВА



КОНКУРС «ОТЛИЧНИК»

продолжается

Прошлый конкурс прошел познавательно и весело, и мы решили продолжить его проведение. Ждем активных и целеустремленных ребят!

С нами учиться веселее!

Публичный конкурс проводится для достижения важной и общественно полезной цели: стимулирования успеваемости учеников Слонимского района.

В конкурсе смогут принять участие ученики 5-11-х классов Слонимского района.

Для того чтобы принять участие в конкурсе, необходимо:

— вырезать купон с пометкой «Конкурс «Отличник», который будет размещаться в каждом номере «Газеты Слонимской»;

— отметить в купоне количество 9 и 10, полученных учеником за текущую учебную неделю, а также указать ФИО учащегося, класс, школу, мобильный телефон родителя для связи, подпись родителя;

— прислать или принести купон в редакцию «Газеты Слонимской» по адресу:

231800, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41.

На купоне указаны даты учебной недели, за которую должны быть внесены оценки. При подведении итогов оценки суммируются со всех купонов, присланных одним участником. В конкурсе участвуют только оригинальные, вырезанные из газеты купоны, копии купонов не принимаются.

8 участников, которые по итогам конкурса наберут наибольшее количество баллов, получат ***сертификат на сумму 50 рублей на посещение кафе «Пятачок» по адресу ул. Красноармейская, 8а***.

Срок проведения конкурса: с 22 ноября 2017 г. по 23 декабря 2017 г.

Купоны принимаются до 29 декабря 2017 г. включительно.

Результаты конкурса будут опубликованы в «Газете Слонимской» 3 января 2018 года.

Приз победителю будет вручен представителем «Газеты Слонимской» в редакции «Газеты Слонимской» с 3 января 2018 г. по 7 января 2018 г. при обращении победителя в редакцию (г. Слоним, ул. Красноармейская, 41).

ВАЖНО! Победителями конкурса станут 8 участников, которые наберут в сумме больше всего баллов. В случае если участников с одинаковым наивысшим количеством баллов окажется больше 8, то приз будет разделен между победителями в равных долях.

Заполняя и подписывая купон, законные представители несовершеннолетнего участника дают согласие на сбор, обработку и хранение персональных данных участников и своих персональных данных для целей проведения настоящего конкурса.

Правила проведения Конкурса «Отличник» читайте также на сайте «Газеты Слонимской» www.gs.by.

ВАЖНО! Организаторы имеют право потребовать дневник участника для сверки присланных и полученных в школе оценок.

Купон — конкурс «Отличник» — Газета Слонимская

ФИО участника

Школа, класс участника

Количество 9 и 10, полученных участником за текущую неделю

Мобильный телефон родителя(ей) для связи
+375 ( ) ____________

(18 — 23 декабря)
Дата учебной недели, за которую должны быть внесены оценки

Подпись родителя

По вопросам обращаться по телефонам: 8-029-118-80-60, 2-90-00, по электронной почте: salejko2013@mail.ru либо в редакцию «Газеты Слонимской» по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41.

Анастасия САЛЕЙКО



УВАЖАЕМЫЕ ЧИТАТЕЛИ!

В рубрике «Поздравляем с днём рождения!» мы поздравим вашего ребенка бесплатно! Приносите или присылайте нам фото своих любимых чад (в конверте по адресу: 231800, РБ, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, 41 или на электронный адрес anna@gs.by).

В письме обязательно укажите имя и фамилию именинника, дату его рождения и возраст. Вложите в своё письмо чистый конверт с маркой и вашим адресом, чтобы мы могли выслать фото обратно. Ждем фото именинников!

Дорогая

Ирина Григорьевна ГОРОДНИКОВА!

С юбилеем, наша дорогая!



Мы хотим от души пожелать,
Чтоб жила ты, болезней не зная!
Ведь тебе всего семьдесят пять!
Молода и прекрасна душою,
Не беда, что морщинки у глаз,
Знай: мы честно гордимся тобою!
Будь здорова и радуй всех нас!

С любовью, муж, дети, внуки, правнуки

Дорогой и самый лучший муж, папочка и дедушка

Николай Михайлович СТРИК!

Поздравляем тебя с юбилеем!

Пусть твое сердце всегда будет теплым от доброты души, не знает ни разочарований, ни обид. Ты достоин самой прекрасной жизни, и пусть она непременно будет такой. Никогда не перестанем удивляться твоему терпению, стремлению к прекрасному и заботе. Желаем быть крепким, здоровым долгие годы, знать, что все, что ты делаешь, не проходит бесследно и ценится больше всего на свете!

Твои жена Алла, сын Геннадий с семьей и дочь Татьяна с мужем



«Газета Слонимская» проводит подписку на первое полугодие 2018 года



Подписавшись на газету, Вы получаете:

✓правдивую информацию и свежие новости Слонима, Зельвы, Мостов;
✓24 страницы с удобно читаемой программой ТВ на неделю;
✓только для подписчиков «ГС» — бесплатная оперативная юридическая консультация;
✓помощь в решении проблем при обращении на горячую линию «Газеты Слонимской»;
✓ полезные советы хозяйкам и садоводам-огородникам, секреты здоровья в рубрике «Здоровье и кухня»;
✓у вас есть шанс войти в историю своего города;
✓ваше селфи в номере;
✓одно бесплатное объявление в месяц;
✓поздравление каждого подписчика бесплатно с днем рождения (при подписке в почтовых отделениях — позвонить в редакцию и сказать дату рождения).

Торопись подписаться на «Газету Слонимскую», не упусти свой шанс!

Цена подписки за один комплект «Газета Слонимская» + «Отдушина»: для индивидуальных подписчиков на 6 месяцев — 32 руб. 76 коп., на 3 месяца — 16 руб. 38 коп., на 1 месяц — 5 руб. 46 коп.

Для предприятий и организаций: на 6 месяцев — 36 руб. 66 коп., на 3 месяца — 18 руб. 33 коп., на 1 месяц — 6 руб. 11 коп.

Подписаться можно во всех почтовых отделениях, а также через систему ЕРИП.

Подписной индекс для индивидуальных подписчиков: 63272;
для предприятий и организаций: 632722.

Редакция «ГС»

Готовим на новогодний стол

Новогодняя ночь не за горами, и мы продолжаем собирать рецепты блюд для праздничного стола. В этот раз мы решили разузнать, как накрывают стол на этот праздник в странах-соседках. Первым, кто нам рассказал про новогодний стол на своей родине, стал Александр Наваленко.

Александр работает педагогом дополнительного образования в Жировичском аграрно-техническом колледже и по совместительству режиссером в РДК. Он родом из Украины и рассказал, что на любом празднике, будь то день рождения, Рождество или даже свадьба, ни одно застолье не проходит без окрошки.

— У нас праздничный стол пришел тоже с советских времен, и там есть те же котлеты, голубцы, еще украинцы готовят гуляш и утку. Но окрошка — это важное блюдо! Оно простое и незатейливое, но не стоит его недооценивать!

ОКРОШКА



Ингредиенты:

Сыворотка — 1 л
Яйца куриные — 2 шт.
Огурец свежий — 2 шт.
Картофель — 2 шт.
Колбаса вареная или куриное филе — 100 г
Сметана — 2 ст. л.
Зеленый лук

Способ приготовления:

Куриные яйца и картофель нужно отварить. То же сделать и с куриным филе, если вы выбрали мясо вместо вареной колбасы.

Затем яйца, картофель, огурцы и колбасу/мясо нарезать небольшими кубиками по 0,5 см. Зелень мелко порубить.

Смешать все ингредиенты, заправить сметаной, залить сывороткой и тщательно перемешать. Добавить соль по вкусу и отправить блюдо в холодильник настояться.

Анастасия САЛЕЙКО

Акция «Дари добро» продолжатся

Уже традиционно перед новогодними праздниками редакция «Газеты Слонимской» проводит благотворительную акцию «Дари добро». Она коснется тех, кто отчаянно нуждается во внимании, а также некоторой помощи.



Подарки от участников акции детям из социально-педагогического центра Слонимского района

В прошлом году благодаря такой акции мы с вами подарили массу приятных моментов тем, кто в них особо нуждался.

Пришло время продолжить наши добрые дела. Под Новый год мы все очень остро нуждаемся в чудесах.

Хочется выразить слова благодарности людям, которые уже приняли участие в акции — Екатерине Ковалёвой, Кристине Салкович, Наталье Томей-Гончарук, Галине Коломиец, слонимчанке Аде. Сладости, одежда, памперсы и многое другое были переданы в педиатрическое отделение Слонимской ЦРБ, в социально-педагогический центр Слонимского района, многодетным семьям.

Если у вас есть возможность помочь детям, да и взрослым, которые попали в сложные жизненные ситуации, пишите: tanyaplahetko@gmail.com, shinkilabelar@gmail.com, в группы «Газеты Слонимской» в соцсетях или звоните 8-029-783-13-99, 8-044-736-91-54.

Вот примерный перечень того, что необходимо:

— памперсы от рождения и далее;
— памперсы для взрослых;
— средства личной гигиены для детей: крем под подгузник, шампуни и т. д.;
— одежда от рождения и далее (возраст любой);
— игрушки.

Если у Вас есть возможность помочь, присоединяйтесь! Акция будет проходить до 31 декабря.

Татьяна ПЛАХЕТКО
TANYAPLAHETKO@GMAIL.COM

ФОТОКОНКУРС

«Мои любимые бабуля и дедуля»

Уважаемые читатели, напоминаем, что газета «Отдушина» проводит фотоконкурс «Мои любимые бабуля и дедуля», который будет проходить с 25 октября по 27 декабря 2017 года.

Для участия в конкурсе необходимо прислать фотографию, на которой запечатлены ваши бабушки и дедушки. Фотографию сопроводите кратким описанием того, кто изображен, расскажите, как вам дорог этот человек.

От одного участника принимается только одна фотография. Ваши фотографии будут опубликованы в газете «Отдушина» и размещены на страничке «ВКонтакте» в альбоме «Фотоконкурс «Мои любимые бабуля и дедуля»».

28 декабря будет проходить голосование в соцсети «ВКонтакте». Проголосовать за понравившееся фото можно будет, поставив отметку «Нравится» (лайк) под фотографией.

Победителем конкурса станет тот участник, чьё фото наберет больше всего голосов. Победителя ждет приз — скамья для прихожей, которую предоставит ЧУПП «Анмикс».

Фотографии присылайте по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, с пометкой «Фотоконкурс», или на эл. ящик: anna@gs.by

Желаем всем удачи!


Редакция газеты





На фото мои дорогие и любимые бабушка Зина и дедушка Роман. Бабушка родилась в Слониме, а дедушка — в далекой Мордовии. Дедушка служил в армии в Слониме. Всю свою жизнь, до ухода на пенсию, работал водителем.

Они очень хорошие, добрые люди с улыбкой на лице. Очень любят друг друга, своих детей, внуков и животных. У них есть правнучек, которого назвали Романом. Я их очень люблю и уважаю.



На фото изображен мой сын Артем Олихвер и моя свекровь Лидия Петровна Олихвер, бабушка Артема.

За что все любят бабушек?
За теплые улыбки,
За вкусные котлетки,
За ласку и конфетки!

Как правильно встретить Новый год 2018 по фэншуй

2018-й — год Желтой Земляной Собаки. Как завоевать благосклонность символа года согласно фэншуй



Чтобы правильно встретить Новый 2018 год по фэншуй, нарисуйте на бумажке комнату. Отметьте, где находятся 4 стороны света. Благо компасы есть во всех современных смартфонах. Затем разместите елочку в одной из сторон, пишут "Подробности".

Северная сторона комнаты — успехи в карьере.

Северо-восточная — поможет приобрести мудрость.

Восточная — несет счастье семье.

Южно-восточная— отвечает за благосостояние дома.

Южная — даст славу и признание.

Юго-западная — сделает брак счастливым.

Запад — к пополнению в семье.

Северо-запад — будет много путешествий.

Центр дома — к здоровью.

Важно расставить в доме как можно больше изображений символа года — Собаки. Это могут быть картинки и фигурки. Кроме того, это семейное животное, оно любит уют в доме.

Украшать елочку нужно всей семьей. При этом важно не ссориться и не ругаться. Украшения должны быть тех цветов, которые любит Желтая Земляная Собака, и обязательно из натуральных материалов: желтый, песочный, золотой и коричневый.

Также на новогоднем дереве обязательно должны быть:

✓мешочки с кофейными зернами — они дадут благополучие

✓колокольчики с синими и зелеными бантиками — для успеха

✓корзиночки с цветами — для достатка

Собака любит поесть, поэтому на новогоднем столе должно быть много блюд, особенно мясных. В центре стола должна быть большая белая свеча, украшенная елочными ветками или золотистыми лентами. Во время Нового года ее нужно зажечь.

Китайцы верят, что рожденным в год Собаки нужно одеться в зеленый цвет, так как он дает счастье.

Согласно фэншуй, за неделю до Нового года нужно купить маленькую записную книжечку. В нее запишите все мечты, которые хотите осуществить в 2018 году. Сначала пишите самые глобальные, а затем — попроще. В конце года 2018 года проверьте: что сбылось, а что нет.

Новый год 2018: в чем встречать

Что надеть на Новый год 2018 и как встретить праздник так, чтобы Желтая Земляная Собака подарила счастье и успех на весь год?

Чтобы задобрить хозяйку года, нужно надевать и готовить на стол то, что ей понравится. Так удастся снискать благосклонность и добиться удачи на все 365 дней.

Если вам интересует, в чем встречать Новый год 2018, то стоит обратить внимание на приглушенные желтые, коричневые, золотистые цвета. Подойдут и черный с серым, пишет "24 канал".

Когда будете встречать Новый год 2018, окружите себя мягкими, пастельными цветами. Старайтесь избегать всего яркого и кричащего.

Для празднования года Желтой Земляной Собаки подойдет одежда желтого, песочного, оливкового, золотистого, коричневого, черного и кофейного цветов. Также можно использовать нейтральные кремовый и молочный цвета.

Собака не терпит вызывающих нарядов, поэтому стоит одеваться сдержанно. В новогоднюю ночь лучшего обойтись без глубоких декольте, прозрачных тканей и высоких разрезов на юбках. Лучше выбрать что-то элегантное, с декором из меха.

Украшения также лучше выбрать более скромные, которые дополнят общий образ.

Зато более чем уместны будут муфты, накидки и шали.

Также немаловажно и то, как вы будете встречать Новый год 2018. Лучше отдать предпочтение большой компании и приготовить побольше мясного.

ВАСИЛИСА ВОЛОДИНА НАЗВАЛА 4 ЗНАКА ЗОДИАКА, ДЛЯ КОТОРЫХ 2018-Й БУДЕТ НА РЕДКОСТЬ УДАЧНЫМ!

Василиса Володина — уважаемый астролог, ее прогнозы на редкость точны, а советы действительно попадают в самое сердце.

Овен

Любая ваша мечта в этом году имеет все шансы сбыться. Конечно же, если Желтой Земляной Собаке она понравится. Вы сможете наконец отдохнуть от постоянной борьбы и жить спокойно.

Для вас на первый план выйдет духовность, вы будете искать ее… Этот год научит вас мудрости. А все остальное получится как бы само собой.

Что-то действительно значимое сможет отыскать вас, и пламя внутри вас будет сиять все ярче, согревая и вдохновляя. Сама Вселенная благословит вас.

Дева

Один из самых благоприятных периодов. Будет много ярких и радостных моментов, также вы сможете расставить приоритеты. Вы наконец расслабитесь и позволите Вселенной подарить вам то, что вы давно уже ждете.

Для вас на первый план выйдет внутренний рост и перерождение. Есть что-то, что вы совсем забросили, но тем не менее именно это дело сулит вам успех.

Близкие люди будут во всем поддерживать вас.

Скорпион

Скорпионы наконец увидят свое окружение таким, какое оно есть, и изменят свое отношение. Вы слишком наступили себе на хвост, но в этом году все изменится. Очень позитивный год для того, чтобы далее двигаться по своему пути — вы получите, все, что хотите.

Для вас на первый план выйдут отношения с самим собой. Этот год подарит вам душевное спокойствие.

Вселенная готовит для вас много счастливых моментов в этом году.

Стрелец


Внутри себя вы уже чувствуете, что новые двери открываются перед вами. Двери в новую жизнь. Готовьтесь к грандиозным переменам, они приведут вас к вашей мечте.

Для вас на первый план выйдет любовь. Больше доверяйте близким людям и относитесь к ним трепетно, и вы получите взамен гораздо больше.

В конце года вас ждет действительно очень радостная новость.

pic-words.ru

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК



ПАЗНАЙ СЯБЕ НА ФОТА

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8(01562) 29-000, 8(029) 133-04-21 з 9:30 да 17:30.



На першамайскай дэманстрацыі. Пазнайце сябе ці знаёмых на гэтым здымку



На фотаздымку, які быў апублікаваны ў мінулым нумары, сланімчанка Галіна Карпенка пазнала свайго сына.

— Другі справа — мой сын, Мікалай Леанідавіч Карпенка. Ён 1971 года нараджэння. А фота зроблена дзесьці ў 80-81-м годзе ў 10-й школе. Цяпер сын працуе начальнікам дыспетчарскай службы ў «Газпрам трансгаз Беларусь», узначальвае прафсаюзны камітэт. Жыве ў Слоніме. Яго сын скончыў універсітэт, таксама пайшоў па слядах бацькі. Фотаздымак спачатку ўбачыла мая нявестка, пасля яго паказалі мне, — расказала гісторыю Галіна Міхайлаўна.

Галіна Карпенка атрымае ад Слонімскага драмтэатра запрашальны білет на два месцы на дзіцячы спектакль «Цуды пад Новы год» на 24 снежня, пачатак у 12 гадзін.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФОТА З АРХІВА «ГС»

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

Чужы штраф



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Спякотным ліпеньскім поўднем у невялікім еўрапейскім гарадку было некалькі фураў з беларускімі нумарамі. Высокі мажны мужчына, з залысінамі на сівой галаве, у блакітнай майцы, падышоў да вадзіцеляў, што сабраліся ля зялёнай машыны. Твар яго быў заклапочаны, у вачах застыў адчай.

— Хлопцы, дапамажыце! — ледзь не маліў землякоў. — Паліцыя аштрафавала на семсот еўра. Сваіх дзвесце маю, а дзе ўзяць яшчэ пяцьсот?! Дапамажыце!

— Ну ты, Пудакевіч, і даеш! Ты з Баранавічаў, я — з-пад Гомеля. Шукай потым ветру ў полі.

— Ага, каб яшчэ якую сотню, а то ўсе пяцьсот... — гаманілі калегі, адводзячы ад Антона вочы. І толькі малады Ігар Заблоцкі, пакапаўшыся ў барсетцы, працягнуў яму запаветныя купюры.

— Аддасі, калі зможаш... Вось мая візітка, я жыву ў Маладзечне, тут адрас.

— Дзякуй, браток, праз два тыдні аддам! Адразу не змагу, бо ў сына вяселле...

— Во, аддасць ён...

— Ага, пакуль вяселле адгуляе, а гэта таксама выдаткі, — вадзіцелі былі ўпэўнены, што паступілі правільна, не пазычыўшы Антону грошай.

Ігар Заблоцкі, прыехаўшы дадому, расказаў пра ўсё жонцы Марыне і цешчы Ядзі.

— Правільна! — з сарказмам прамовіла жонка. — У нас двое хлопцаў-школьнікаў, на іх адзенне і абутак нібы гарыць, не паспяваю купляць, дом ніяк не дабудуем, а ён грошы направа і налева раздае. Гэта ж падумаць, чужы штраф заплаціў!

— Ага! — ажно пачырванела ад злосці цешча. — Ужо які год седзіце ў маёй хаце, не каб у свой дом перабрацца, даць мне святы спакой на старасці, то ён капейку не ашчаджае, раздае невядома каму! Розум ужо павінен мець, табе ж амаль сорак гадоў!

— Вам, бабы, каб толькі грошы, а як яны мне дастаюцца, то і ведаць не хочаце. Сёння Антон трапіў у такую сітуацыю, а заўтра я траплю. Далёка ад дому, чужая краіна... Хто дапаможа, калі не свой брат-вадзіцель?

Бабы лямантавалі да знямогі, а ён, узяўшы бялізну, пайшоў спаць у пуню на сена. Недалёка ззяў вячэрнімі агнямі горад, было душна, жаданай прахалоды не прынёс нават вечар. Ігар так стаміўся за дарогу, што заснуў, ледзь толькі галава дакранулася да падушкі.

Назаўтра жонка і цешча адварочваліся ад яго і не размаўлялі, снеданне не прапанавалі, і ён паеў чэрствага батона з чаем, узяў сякеру і пайшоў правіць плот ад выгану, бо каровы ледзь зусім не даламалі. Шкадаваў, што сыны ў лагеры, а то хоць з імі пагаманіў бы, адвёў бы душу.

Байкот сямейнікі трымалі і заўтра, і паслязаўтра. Ужо былі невыносныя і касыя погляды, і зацятае маўчанне. Калі пазванілі з фірмы аўтаперавозак і сказалі, што зноў трэба ехаць у рэйс, абрадаваўся як ніколі. Ён любіў сваю работу, дарогу, волю, калі над табой няма начальнікаў. Як машына ў парадку, дакументы на груз таксама, то зялёнае святло табе па ўсёй трасе.

Вярнуўся акурат тады, як Антон Пудакевіч павінен быў аддаць доўг, нават адзін дзень мінуў лішні. Спадзяваўся, што тыя няшчасныя пяцьсот еўра ўжо дома, але па зацятых тварах сваіх кабет зразумеў, што гэта не так.

— Ну што, дзе ж твой даўжнік з грашамі? — з`едліва мовіла цешча, калі Ігар, нават не заходзячы ў хату, скінуў сарочку і абліўся да пояса халоднай калодзежнай вадой. Моцны торс і твар былі пакрыты цёмным, амаль шакаладным, загарам, густыя кучаравыя валасы не змагла распрастаць вада, і яны ляжалі прыгожымі чорнымі хвалямі.

Ігар маўчаў.

— Трэці тыдзень пайшоў, калі ты ўмееш лічыць, — выйшаўшы на ганак, замест прывітання, мовіла жонка.

— Ну дык і што, можа, у чалавека цяпер няма грошай?

— Ну а ў цябе яны лішнія?! — цешча каршуном круцілася ля яго. — Няма грошай... — перадражніла. Дзе тыя Баранавічы, а дзе наша Маладзечна. Паедзеш шукаць, каб спагнаць доўг? Хоць адрас яго ў цябе ёсць?

— Няма. Людзям трэба верыць...

Мінуў яшчэ тыдзень. Рэйсаў не было, і Ігар проста змарнеў ад цешчынай і жончынай звягі, шукаў сабе які занятак, абы не сядзець у хаце. Шчыра кажучы, ужо ён і сам пачаў сумнявацца, што даўжнік прывязе яму тыя пяцьсот еўра. Па грашах не бедаваў, хоць і даставаліся цяжка. Крыўдна было б расчаравацца ў чалавеку.

Аднойчы вечарам у дзверы пастукалі. Цешча пайшла адчыняць і неўзабаве вярнулася са старой жанчынай у цёмным адзенні. Сівая галава была павязана чорнай хусцінкай.

— Ці не вы будзеце Ігар Заблоцкі? — спытала, гледзячы на маладога чалавека.

— Я...

— А я мама Антона Пудакевіча. Прывезла вам пяцьсот еўра і шчырую падзяку за тое, што выручылі. Даруйце, што не тады, як абяцаў сын...

Жанчына горка заплакала, села на табурэтку, якую падаў Ігар.

— Не атрымалася адразу... За ўнукавым вяселлем трэба было ладзіць сынава пахаванне.

— А што з ім? — устрывожыўся Ігар.

— Памёр раптоўна... У дарозе, за рулём фуры. Дактары сказалі, ад інфаркту... Усё адно як адчуваў сваю канчыну, напярэдадні прынёс мне пяцьсот еўра і ваш адрас, сказаў: «Мама, як са мной што здарыцца, завязі гэта добраму чалавеку і падзякуй...» — Яна працягнула грошы.

— Трыста вазьму, а дзвесце пакіньце сабе, бо нічым больш не магу памагчы ў такім горы... Шчыра вам спачуваю...

Жонка і цешча згодна захісталі галовамі, іх вочы былі поўныя слёз...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Як слонімцы будуць адпачываць у калядныя святы

Урадам Беларусі прынята пастанова пра перанос працоўных дзён у 2018 годзе. Найбліжэйшыя пераносы чакаюць нас на навагоднія і калядныя святы.

Працоўныя дні на Новы 2018 год пераносяцца: з аўторка **2 студзеня на суботу 20 студзеня**. Гэта значыць, што на Новы год беларусы, і ў тым ліку слонімцы, будуць адпачываць чатыры дні — з 30 снежня да 2 студзеня.

Нагадаем, што тры выходныя мы будзем адпачываць на каталіцкія і пратэстанцкія Каляды **з 23 да 25 снежня 2017 года**. А ў праваслаўных вернікаў Каляды прыпадаюць на нядзелю 7 студзеня 2018 года.

Мікіта ПАСТУХОЎ
N.PASTYHOW@GMAIL.COM

АФИША

Театр

24 ДЕКАБРЯ, ВОСКРЕСЕНЬЕ
Для детей «Шмат прыгод пад Новы год», начало в 12.00

27 ДЕКАБРЯ, СРЕДА
Новогоднее представление
13:00-13:45 — праздничная игровая программа (пл. Ленина);
14:00-16:00 — «Щелкунчик» (по пригласительным билетам)

Центр культуры и отдыха

Концертный зал

26 ДЕКАБРЯ, ВТОРНИК
Концерт ансамбля «Песняры», начало в 18.00

Кинозал

20 ДЕКАБРЯ, СРЕДА
«Мы — монстры» 3D, начало в 12.00
«Новогодний переполох» 2D, начало в 21.00

21 ДЕКАБРЯ, ЧЕТВЕРГ
«Фердинанд» 3D, начало в 12.00
«Звёздные войны: Последние джедаи» 3D, начало в 18.00, 21.00

22 ДЕКАБРЯ, ПЯТНИЦА
«Фердинанд» 3D, начало в 12.00
«Звёздные войны: Последние джедаи» 3D, начало в 18.00, 21.00

23 ДЕКАБРЯ, СУББОТА
«Фердинанд» 3D, начало в 12.00
«Три богатыря и принцесса Египта» 2D, начало в 14.00
«Новогодний переполох» 2D, начало в 16.00
«Звёздные войны: Последние джедаи», начало в 18.00, 21.00

24 ДЕКАБРЯ, ВОСКРЕСЕНЬЕ
«Фердинанд» 3D, начало в 12.00
«Три богатыря и принцесса Египта» 2D, начало в 14.00
«Новогодний переполох» 2D, начало в 16.00
«Звёздные войны: Последние джедаи», начало в 18.00, 21.00

Центральная площадь

23 ДЕКАБРЯ, СУББОТА
14:30-18:00 — «НаШествие Дедов Морозов»

Главный редактор Виктор Владимирович Володащук

Учредитель
Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до **18.00**
Skype — gazslon

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 19 декабря 2017 года 15:00

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
Заказ № 6481

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



